■ У глыб стагоддзяў

# КУЛІ, БРАНЗАЛЕТЫ, АБРАЗКІ ДЫ МАНЕТЫ

## Горад на шляху «з варагаў у грэкі» сёлета раскопвалі валанцёры з усяго свету

**Гісторыя гэтага краю цесна звязана з Дняпром, які злучае паўночныя моры з Чарнаморскім басейнам, Скандынавію з землямі колішняй Візантыі. Маленькі райцэнтр Лоеў — усяго за 55 кіламетраў ад Гомеля. Гарадскі пасёлак стаіць на высокім правым беразе Дняпра, у месцы, дзе з ім злучаецца Сож. З берага адкрываецца маляўнічы від на заліўныя лугі ў лукавіне рэк. Непасрэдна ў горадзе па рацэ праходзіць дзяржаўная мяжа з Украінай. Палова рэчышча — беларуская, другая — украінская. Геаграфічнае становішча Лоева з даўніх часоў вызначыла яго гістарычны шлях. Зручнае месцазнаходжанне імкнуліся выкарыстоўваць і тыя, хто тут жыў, і тыя, хто кваліўся на гэтыя землі.**

З каменнага веку насельніцтва абжыло высокі бераг, выгадны камунікацыйны вузел. Але калі менавіта на Лоевай Гары ўзнікла гарадское паселішча — гэта пытанне застаецца адкрытым, хоць афіцыйная дата ўпамінання Лоева ў летапісе — 1505 год, калі населены пункт быў спалены крымскімі татарамі. У сувязі з гэтымі падзеямі яму і «пашанцавала» трапіць у пісьмовыя крыніцы.

Знішчэнне гарадка адбывалася некалькі разоў на працягу XVI—XVII стст., але ён настойліва і ўпарта адраджаўся. Амаль пяць стагоддзяў Лоеўшчына ўваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. З канца XV стагоддзя Маскоўская дзяржава вяла шматгадовыя войны з Вялікім Княствам за валоданне памежнымі тэрыторыямі. Лоеўскія землі былі арэнай пастаянных сутыкненняў. На гэтым фоне знамянальна тое, што Лоеў 3 жніўня 1576 года атрымаў магдэбургскае права. Такая падзея сведчыць, што ён здабыў статус значнага цэнтра вытворчасці і грашова-таварнага абмену.

31 ліпеня 1649 года каля Лоева адбылася буйная бітва часоў казацка-сялянскай вайны 1648—1651 гадоў паміж войскамі польнага гетмана літоўскага Януша Радзівіла і казацкай арміяй Сцяпана Падбайлы і Міхаіла Крычэўскага. Падчас двухдзённай бітвы пад Лоевам загінула больш за 12 тысяч ваяроў. У 1651 годзе пад Лоевам адбылася другая бітва дзяржаўнага войска з казакамі. Абедзве бітвы скончыліся разгромам казацкіх войскаў.

На працягу 150 гадоў барацьбы за ўладу і тэрыторыі землі ў вусці Сожа пастаянна спусташаліся. Пра гэта сведчаць шматлікія знаходкі свінцовых куль, жалезных ядраў, спаленыя рэшткі селішчаў... Гэтым летам у Лоеве каля рэшткаў печы ў пабудове XVII—XVIII стст. быў знойдзены «клад» свінцовых куль. Гісторыкі сцвярджаюць, што тады загінуў кожны трэці жыхар беларускай часткі Вялікага Княства.

Пачуццё нацыянальнай годнасці і гонар за гістарычны шлях сваёй малой радзімы могуць быць умацаваны з дапамогай «рэтраспектыўй углыбіню». Закласці раскоп у патрэбным месцы — значыць куды больш даведацца пра свае карані, якія нечакана прарастаюць археалагічнымі знаходкамі. **Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ганна ЦІМАФЕЕНКА** разам з групай замежных валанцёраў і жыхароў г. п. Лоеў сёлета вяла раскопкі ў гарадку. Комплексная міжнародная гісторыка-археалагічная экспедыцыя была праведзена на тэрыторыі помніка археалогіі «Гарадзішча ранняга жалезнага веку і сярэднявечнага горада Лоева (V ст. да н. э. — II ст. н. э., X—XVIII стст.) у г. п. Лоеў». Да работ на месцы былога Лоеўскага замка прыцягнулі аматараў — маладых людзей з розных краін свету. 22 чалавекі прыехалі сюды з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Японіі, Нідэрландаў, Германіі, Іспаніі, Францыі, Турцыі, Расіі... Ініцыятыву, дарэчы, падтрымалі і жыхары Лоева. Каля чатырох дзясяткаў мясцовых грамадзян, у тым ліку дзяцей і школьнікаў, працавалі выключна "за інтарэс". Яны адчулі сябе адкрывальнікамі старажытнай гісторыі роднай зямлі.



Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ганна ЦІМАФЕЕНКА.

— Валанцёры працавалі ў межах праекта, — расказвае Ганна Цімафеенка, — мэта якога — праз мерапрыемствы па захаванні і папулярызацыі агульнай гісторыка-культурнай спадчыны садзейнічаць развіццю і ўмацаванню сяброўства і супрацоўніцтва маладзёжных арганізацый Еўропы. Арганізатарамі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ліга добраахвотнай працы моладзі, Лоеўскі педагагічны каледж пры дапамозе Лоеўскага райвыканкама і Музея бітвы за Днепр. Усе размаўлялі на англійскай мове. Былі вельмі розныя маладыя людзі. І тыя, хто адаптаваны да жыцця, і тыя, хто не вельмі...

Археолаг сцвярджае, што вывучаць Лоеў вельмі цікава, помнікаў археалогіі ў акрузе многа. Людзі ў гэтым месцы жылі з каменнага веку, знакавыя падзеі адбываліся пачынаючы са скіфскіх часін і да падзей Вялікай Айчыннай вайны. Лоеў мае магутныя напластаванні XVII—XVIII стагоддзяў, а адлік гісторыі гарадскога паселішча можна весці з X—XI стагоддзяў.

— Раскопкі тут можна рабіць амаль на кожным агародзе, бо старажытны горад знаходзіцца практычна ў межах сучаснага, — адзначае Ганна Цімафеенка. — Адзін з мясцовых добраахвотнікаў паабяцаў, што дазволіць, калі спатрэбіцца, налета капаць на сваім прысядзібным участку. Мінулай восенню мы распрацавалі дзве траншэі ўздоўж рэчышча Дняпра, прабілі ўсю тэрыторыю старажытнага гарадзішча. Адной са сваіх траншэй мы прарэзалі роў старажытнага замчышча на глыбіню 1,8—1,9 метра, але не дабраліся да адкладаў старэйшых за XVII стагоддзе. У XVII стагоддзі роў ужо не функцыянаваў — ён быў засыпаны, і на гэтым месцы жылі людзі. Замкавыя ж умацаванні былі перанесены далей на поўнач, у бок Лоеўскага геалагічнага агалення. Мы спадзяёмся, што будзе магчымасць працягнуць работы, раскапаць роў далей і даведацца, што знаходзіцца на яго дне. Такім чынам, зразумець, калі і кім ён быў зроблены.

Глабальныя адкрыцці ў археалогіі здараюцца раз у 10—15 гадоў, гаворыць Ганна Рыгораўна. Але для таго, каб гэта адбывалася, археолагі працягваюць рабіць руцінную планамерную работу, якая дазваляе збіраць матэрыял і ісці да пэўных навукова абгрунтаваных высноў:

— Добра, што мы пачалі вывучаць старажытны Лоеў. Мы сталі разумець яго структуру: вызначылі месца і прыкладную плошчу дзядзінца, вакольнага горада, пасадскіх тэрыторый, характар і магутнасць гарадскіх умацаванняў... Але мы толькі падыходзім да адказу на пытанне — наколькі інтэнсіўным тут было жыццё ў розныя гістарычныя перыяды? Сёлета мы заклалі раскоп за ровам старажытнага гарадзішча. У раскопах дамінавалі знаходкі XVII—XVIII стагоддзяў, калі ў Лоева былі моцныя эканамічныя і культурныя сувязі з сучаснымі ўкраінскімі землямі. Між тым украінскія калегі вельмі актыўна вывучаюць менавіта гэты перыяд сваёй гісторыі, бо тады нараджалася іх дзяржаўнасць.

**Каля чатырох дзясяткаў мясцовых грамадзян, у тым ліку дзяцей і школьнікаў, працавалі выключна «за інтарэс». Яны адчулі сябе адкрывальнікамі старажытнай гісторыі роднай зямлі.**

У выніку работ за два гады даследавана плошча памерам больш за 90 квадратных метраў, пры гэтым былі знойдзены прадметы, якія маюць значную каштоўнасць: манеты XV—XIX стст., у т. л. пула часоў ардынскага нашэсця, орт і талеры перыяду Вялікага Княства Літоўскага, фрагменты шкляных жаночых бранзалетаў XII—XIII стагоддзяў, пацеркі, кераміка XII-XIX стагоддзяў, свінцовыя кулі, гліняныя і жалезныя ядры, люлькі, бронзавы абразок «Раство Хрыстова» XVIII стагоддзя, развал печы XVIII стагоддзя і іншыя артэфакты. Усё знойдзенае цяпер вывучаецца ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Там і будзе зроблена больш дакладная атрыбуцыя старажытных прадметаў. З часам плануецца зрабіць частковую музеефікацыю гістарычнай часткі Лоева.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.